Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Студенческое научное общество БарГУ

# СОДРУЖЕСТВО НАУК.
# БАРАНОВИЧИ-2016

Материалы XII Международной
научно-практической конференции
молодых исследователей

(Барановичи, 19—20 мая 2016 года)

В трёх частях

Часть 1

Репозиторий БарГУ

Барановичи
БарГУ
2016

УДК 001(082)

В часть 1 сборника материалов XII Международной научно-практической конференции молодых исследователей «Содружество наук. Барановичи-2016» включены материалы докладов по актуальным проблемам различных научных направлений: филологические науки (русский, белорусский языки); лингвистика (английский, немецкий языки); методика преподавания иностранного языка, правоведение.

Сборник адресован преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, В. Н. Кременевская (отв. секретари),
О. Н. Фенчук, Т. М. Пучинская, А. А. Савко, Н. А. Егорова, М. В. Андрияшко

Рецензент

кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой германских языков факультета
международных отношений Белорусского государственного университета М. Ф. Арсентьева

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-735-4 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-498-734-7**

© БарГУ, 2016

6. Алексиевич С. Чернобыльская молитва: Хроника будущего. С. 51.
7. Там же. С. 351.
8. Там же. С. 137.
9. Там же. С. 139.
10. Там же. С. 296.
11. Сивакова Н. А. Предисловие в творческой системе С. Алексиевич: состав, функции, внутренняя организация // Христ. гуманизм и его традиции в славян. культуре : сб. науч. ст. / Гомел. гос. ун-т ; редкол.: Т. Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]. Гомель, 2010. Вып. 2. С. 73—77.
12. Алексиевич С. Чернобыльская молитва: Хроника будущего. С. 37.
13. Там же. С. 247.
14. Алексиевич С. Чернобыльская молитва. М. : Остожье, 1998. 223 с.
15. Алексиевич С. Чернобыльская молитва: Хроника будущего. С. 379.

УДК 811.161.3:82-31Разанаў

**М. В. Ермаловіч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# СІНТАКСІЧНЫЯ СРОДКІ ПАМЯНШЭННЯ АБ’ЁМУ ВЫКАЗВАННЯ Ў ТВОРАХ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

**Уводзіны.** Важнае месца сярод граматычных экспрэсіўных сродкаў адводзіцца сінтаксічным, якія ўжо даследаваны ў працах Г. М. Акімавай, В. В. Аляксандравай, Э. М. Берагоўскай, Ю. М. Маліновіч, В. А. Маславай, А. П. Скавароднікава і інш. Як адзначае Н. Э. Шандорха, «экспрэсіўнымі лічацца ўсе фігуры маўлення, пераважная частка якіх заснавана на законах сіметрыі — сінтаксічны паралелізм, антытэза, хіязм, полісіндэтон і іншыя. І, наадварот, парушаецца сіметрычная структура ў інверсіі, сегментацыі, парцэляцыі, эліпсісе і інш.» [1, с. 7]. Сінтаксічныя фігуры часта «актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, узмацняюць эстэтычную выразнасць і эмацыянальнасць выказвання, пазбаўляюць мастацкую мову аднастайнасці, надаюць ёй стылістычную разнастайнасць і тым самым дапамагаюць лепш выявіць вобразную думку пісьменніка, перадаць яго душэўнае хваляванне» [2, с. 302]. Да сінтаксічных сродкаў выражэння эмоцый даследчыкі адносяць сінтаксічныя фігуры павелічэння і памяншэння аб’ёму выказвання. У сваіх творах А. Разанаў актыўна выкарыстоўвае экспрэсіўныя сінтаксічныя фігуры.

**Асноўная частка.** Да сінтаксічных фігур памяншэння аб’ёму Н. Э. Шандорха адносіць: эліпсіс, эсіндэтон, умаўчанне, зеўгму. Фігуры з памяншэннем аб’ёму выказвання, абумоўленыя тэндэнцыяй да эканоміі моўных сродкаў, дазваляюць максімальна перадаць змест пры мінімальнай затраце моўных сродкаў, надаюць маўленню энергічнасць.

Умаўчанне як прыём экспрэсіўнага сінтаксісу — «пропуск таго, што вельмі значна. Гэта сінтаксічная фігура, пры якой маўленне знарок рэзка абрываецца, каб перадаць пэўныя эмоцыі гаворачага, зразумелым становіцца толькі агульны сэнс выказвання. Графічна гэта фігура абазначаецца шматкроп’ем» [3]. У творах А. Разанава знаходзім прыклады ўмаўчання:

– у пачатку сказа: ...Сілай апоры пераадолеўшы сілу цяжару, выкінуся на тратуар [4, с. 26]; ...Мэта мэты — станавіцца ўсім жыццём [5, с. 256]; …Прыпаў да занавескі // знясілены // прамень, // акамянела вестка… [6, с. 269] і інш.;

– у сярэдзіне сказа: Праз акуляры: ніводнай карціны не для сябе і для сябе ніводнай… // што бачыць у змроку сава чаго я не бачу… // карціны ўбіраюць змрок праз чуйныя акуляры [7, с. 100]; Людзі, што мне сустрэліся ўчора і пазаўчора і што сустракаюцца сёння... // уваходзяць яны ў мой лёс, быццам яны гэта я таксама [8, с. 97]; І я паспеў: я той, хто не свіння... // я той, хто не свіння... // паспеў прамовіць // і закруціўся, згінуў... [9] і інш.;

– у канцы сказа: Тут нешта тоіцца, // нешта хаваецца, // нешта ўхіляецца ад разгляду…; Абуджаюся і засынаю, // а ўсё няпоўны мой сон, усё няпоўнае абуджэнне… [10]; У завеі — зямля, у завеі — дрэвы, людзі, якія жылі і якія яшчэ не жылі, у завеі, // і я таксама ў завеі… [11] і інш.

Даследчык А. Багамолава адзначае, што «разнастайнасць эмоцый, укладзеных у ўмаўчанне, перадаецца не толькі зместам выказваннння, але і пунктуацыйна, паколькі незавершаная думка можа афармляцца як адным шматкроп’ем, так і камбінаваннем яго з іншымі знакамі прыпынку» [12, с. 88]. Пісьменнік А. Разанаў часта спалучае шматкроп’е з клічнікам, пытальнікам, клічнікам і пытальнікам разам узятымі, напрыклад: Боязь засцерагае: у будучыні — смерць!.. // Адвага натхняе: у будучыні — неўміручасць!.. [13]; Знямелыя дрэвы // ахутаў спагадлівы снег: // ён — цёплы?!. [14, с. 75]; А дзе было пуста — думаў: куды дзяваюцца слімакі?.. Куды дзяваюцца слімакі з ракавак?.. [15] і інш.

Умаўчанне можа завяршаць такую стылістычную фігуру, як рытарычнае пытанне — «разнавіднасць пытальнага сказа, яно заключае ў сабе сцвярджэнне ці адмаўленне пэўных рэалій» [16], напрыклад: Хіба ўвесь шлях чалавека абмежаваўся зямлёй?!. // Хіба ўвесь сэнс чалавека замкнуўся наўколлем?!. // Хіба мае моц і вагу адно толькі тая думка, якая засціць?!. [17]; У чым справядлівасць — што людзі жывуць або што паміраюць?.. // У чым справядлівасць для іх і ў чым для цябе?.. [18]; Хіба, каб адолець дарогу спаўна, канчаткова, дарэшты, трэба спаткнуцца аб кожны камень, зваліцца ў кожную яму, патрапіць у кожны след?!. Хіба трэба кожнаму быць адразу

© Ермаловіч М. В., 2016



Репозиторий БарГУ

і гэтым, і тым, і вось тым, і вось гэтым?!. Альбо наогул не быць нікім?!. [19]. Мэта гэтай фігуры — перадаць яркія разнастайныя аўтарскія эмоцыі, не пакінуць чытача абыякавым да зместу твора.

Зеўгма — «сінтаксічная фігура, у межах якой да аднаго апорнага слова адносяцца два або больш слоў, якія раўнапраўныя граматычна, але абсалютна адрозныя паміж сабой семантычна» [20]. Гэтая сінтаксічная фігура дае магчымасць успрымаць далёкія і лагічна не аднародныя паняцці ў змесце твораў А. Разанава як аднародныя члены: Хлеб есца, смокчацца, грызецца, «хлябаецца» і генетычна памятае свой радавод, сваю бацькаўшчыну — глебу [21]; А я ўсё стаю на тым самым месцы, // здранцвелы, // уражаны, // праяснёны, // не маючы мовы, каб гаварыць, — // з маланкаю ў сэрцы [22].

Таксама А. Багамолава вылучае такую сінтаксічную фігуру, як зварот, або апастрофа, — гэта «калі аўтар звяртаецца з прамовай да неадушаўлёных прадметаў як да адушаўлёных» [23]. У аснове гэтай фігуры з'ява метафарызацыі, калі пісьменніку ўяўляецца нежывое жывым. Звароткі перадаюць разнастайныя эмоцыі, але зразумець іх можна толькі праз кантэкст. Напрыклад, у творах А. Разанава знаходзім: Дзічка-дзічка, чаму ты не груша? [24]; І што мне з вамі рабіць, // шматкі мінулага часу?!. [25]; Не спыняйся, маладосць!.. [26] і інш.

**Заключэнне.** А. Разанаў у сваіх творах выкарыстоўвае сінтаксічныя фігуры памяншэння аб'ёму выказвання, якія дапамагаюць чытачу зразумець сэнс выказвання, перадаюць пэўныя эмоцыі аўтара, псіхічны і фізіялагічны стан персанажа, засяроджваюць увагу на найбольш важнай з пазіцыі аўтара інфармацыі, узмацняюць экспрэсію выражэння і ўздзеянне на адрасата.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Шандорха Н. Э. Экспрэсіўны сінтаксіс : вучэб.-метад. дапам. Гродна : ГрДУ, 2002. 62 с.
2. Рагойша В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. Мінск : Беларус. энцыкл. 2001. 302 с.
3. Шандорха Н. Э. Экспрэсіўны сінтаксіс. С. 34.
4. Разанаў А. С. Рэчаіснасць. Мінск : Маст. літ., 1998. 171 с.
5. Разанаў А. С. Паляванне ў райскай даліне. Мінск : Маст. літ., 1995. 143 с.
6. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія : у 2 кн. / П. М. Лапо [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2011. Кн. 2. 944 с.
7. Разанаў А. С. Шлях-360. Мінск : Маст. літ., 1981. 88 с.
8. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. Мінск : Маст. літ., 1988. 69 с.
9. Разанаў А. С. Шлях-360. С. 10.
10. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 63.
11. Разанаў А. С. Паляванне ў райскай даліне. С. 51.
12. Багамолава А. Сінтаксічныя сродкі стварэння экспрэсіўнага мастацкага маўлення // Родн. слова. 2012. № 10. С. 87—90.
13. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 8.
14. Разанаў А. С. У горадзе ўладарыць Рагвалод. Мінск : Маст. літ., 1992. 108 с.
15. Разанаў А. С. Шлях-360. С. 31.
16. Багамолава А. Сінтаксічныя сродкі стварэння экспрэсіўнага мастацкага маўлення. С. 88.
17. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 12.
18. Разанаў А. С. Шлях-360. С. 31.
19. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 40.
20. Шандорха Н. Э. Экспрэсіўны сінтаксіс. С. 37.
21. Разанаў А. С. У горадзе ўладарыць Рагвалод. С. 31.
22. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 55.
23. Багамолава А. Сінтаксічныя сродкі стварэння экспрэсіўнага мастацкага маўлення. С. 88.
24. Разанаў А. С. Вастрыё стралы. С. 11.
25. Разанаў А. С. У горадзе ўладарыць Рагвалод. С. 83.
26. Разанаў А. С. Шлях-360. С. 19.


УДК 811.161.1'373.611

**Ю. С. Иванчикова**
*Учреждение образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины», Гомель*

## СЕМАНТИКА ИНТЕНСИВНОСТИ В СЛАВЯНСКОМ ЭТИМОЛОГИЧЕСКОМ ГНЕЗДЕ С КОРНЕМ **VEL-//*VOL-*

**Введение.** Праславянский корень **vel-//*vol-* восходит к индоевропейскому корню **u̯el-* 'желать, хотеть; выбирать, предпочитать', 'давить, напирать' [1, с. 139]. Эта семантика является первичной. Индоевропейский корень **u̯el-//*u̯al-* реконструируется со значением 'иметь силу', 'быть сильным' [2]. Значение корня 'иметь силу', 'быть сильным' (отражённое в производных от праславянского корня **vold- (владеть, власть, владыка)*) метонимически тесно связано с исходным 'давить, напирать', сравним о.-с. **daviti* 'душить, умерщвлять' [3], современный *давить* 'налегать тяжестью', 'стискивать, сжимать', 'душить', 'надавливая, ломать' и др. [4, с. 361], т. е. применять *силу*. Модальное семантическое направление 'желать, хотеть' является основным, так как оно

© Иванчикова Ю. С., 2016



Репозиторий БарГУ